Учреждение
«Зональный государственный архив
в
г. Кричеве»

Виртуальная выставка
приуроченная
к Году Белорусской женщины

# «Свет души и сила рук: портрет сельских тружениц Кричевщины»

2026 г.

Подготовила:
ведущий архивист
Кондратенко Виктория
Валерьевна

У каждого времени свои герои
или героини. После войны, особенно в период первой послевоенной пятилетки, женщины стали главной рабочей силой в сельском хозяйстве БССР, составляя в 1944–1945 гг. до 80–90% трудоспособных колхозников. Они заменили ушедших на фронт мужчин, освоив тракторы, комбайны и тяжелый ручной труд, обеспечив возрождение сельского хозяйства и продовольственную базу страны.

# Несмотря на тяготы послевоенной повседневности, женщины демонстрировали высокие производственные показатели



ВЕ ВЯЛІКІ ...

★★★

## Нашы поспехі ў працы

Вось ужо 10 год я працую на заводзе гумавых вырабаў. Калі ўпершыню пачала вырабляць боты, былі няўдачы. Але з цягам часу я добра авалодала сваёй спецыяльнасцю і вырабляемая мною прадукцыя стала мець толькі выдатную якасць.

Свой вопыт работы, сваё ўменне я перадаю маладым рабочым. Для мяне бывае найвялікшая радасць, калі я бачу, што мае вучні пачынаюць праяўляць поспехі ў працы. Дзесяткі рабочых цяпер добра авалодалі сваёй спецыяльнасцю і выконваюць дзённыя заданні па клейцы ботаў на 110—115 працэнтаў.

Брыгада, якую ўзначальваю я, сістэматычна выконвае і перавыконвае месячныя заданні. Выпускаемая прадукцыя мае толькі выдатную якасць.

У перадмайскім соцыялістычным спаборніцтве калектыў брыгады дабіўся новых вытворчых поспехаў. Асабліва добра працавалі ў гэтыя дні нашы лепшыя майстры Ольга Сямёнава, Надзежда Чугарова, Вера Дубас, Клаўдзія Падласава, закройшчыца Ніна Зарэцкая і другія. Яны сістэматычна выконвалі зменныя заданні на 120—130 працэнтаў.

Нашы поспехі ў працы тлумачацца тым, што мы нясупынна павышаем тэхнічныя веды ўсіх рабочых. У брыгадзе рэгулярна праводзяцца практычныя заняткі. Работніцы з вялікім вытворчым стажам навучаюць моладзь, якая зусім нядаўна прышла на завод. Асабіста я абучаю Антаніну Гатоўчык, Ксенію Краўцову, Валянціну Ульянаву і Раісу Вацура. Дзяўчаты вельмі старанна вывучаюць тэхналогію клейкі гумавых ботаў. Пройдзе некаторы час, і яны стануць добрымі майстрамі сваёй справы.

Радасны дзень Першае мая мы адзначаем паспяховым выкананнем красавіцкага плана работы. Не зніжаючы тэмпаў у працы, мы даб'ёмся яшчэ больш значных поспехаў.

**Е. Карнеева,**
брыгадзір цэха завода гумавых вырабаў.

НА ЗДЫМКУ: брыгадзір цэха завода гумавых вырабаў Елена Цімафееўна Карнеева.

Бригадир цеха
завода резиновых
изделий
**Елена Тимофеевна**
**КОРНЕЕВА**
**1954 г.**



НА ЗДЫМКУ: брыгадзір цэха завода гумавых вырабаў Елена Цімафееўна Карнеева.

Передовые животноводы района (слева направо) Телятница - **ВАСИЛЕВИЧ Е.М.;** доярки - **КОРДЕНКОВА С.Ф.; ИГНАТУШКО М.Г..**

## ПЕРАДАВЫЯ ЖЫВЁЛАВОДЫ РАЁНА



*На здымку: (злева направа) цялятніца калгаса „Ударнік" гарадскога Совета Васілевіч Е. М., якая ў 1954 годзе вырасціла 46 цялят да шасцімесячнага ўзросту; даярка калгаса „Соцыялістычны шлях" гарадскога Совета Кардзенкова С. Ф., атрымаўшая 12 цялят ад замацаваных за ёю 12 нецелей; даярка калгаса „Ударнік" гарадскога Совета Ігнатушка М. Е., якая ад кожнай з 13 замацаваных за ёю кароў надаіла сёлета па 1.400 літраў малака.*

**1954 г.**

## Передовая телятница колхоза «Ударник» Мария Григорьевна ИГНАТУШКО

***

### Няспынна павялічваць надоі

Уключыўшыся ў соцыялістычнае спаборніцтва за павышэнне надояў малака, у бягучым годзе я абавязалася ад кожнай замацаванай за мной каровы надаіць 1.500 літраў малака. За 8 месяцаў надой ад кароў маёй групы склаў 7.474 літры.



Асабліва павысілася прадуктыўнасць статку ў пашавы перыяд.

Каб атрымаць яшчэ больш малака ад кожнай каровы, перш за ўсё, неабходна наладзіць старанны догляд за жывёлай. Следуючы прыкладу перадавых жывёлаводаў, мы арганізавалі сёлета кругласутачную пасьбу кароў. Гэта станоўча адбілася на надоях малака. Зараз па параўнанню з першымі днямі пашавага ўтрымання надоі малака ад кожнай каровы павялічыліся прыкладна да 5 літраў.

Нямалаважную ролю ў павелічэнні надояў малака адыгрывае і індывідуальны падыход да жывёлы. Нярэдка бываюць выпадкі, што тая або іншая карова не аддае поўнасцю малако. Вось тут і патрэбна находлівасць, уменне даяркі.

Рабочы дзень на нашай ферме пачынаецца з 6 гадзін раніцы. У гэты час мы праводзім першую дойку. Сёлета я ўпершыню стала рабіць каровам масаж вымя. Гэта таксама сказваецца на колькасць надоенага малака. Пасля дойкі я абавязкова правяраю кожную карову: ці ўсё малако выдаена.

Вялікую дапамогу ў павышэнні надояў малака нам аказваюць калгасныя пастухі. Вядома, што ад правільнай пасьбы жывёлы залежыць вельмі многае. Жывёла ў нас пасецца на працягу больш 20 гадзін у суткі.

Прымяняючы перадавыя метады працы, я з дня ў дзень дабіваюся ўсё новых і новых поспехаў у павышэнні прадуктыўнасці жывёлы. І я ўпэўнена, што ўзятае абавязацельства — надаіць па 1.500 літраў ад кожнай замацаванай за мной каровы — з поспехам выканаю.

**М. Ігнатушка,**
даярка калгаса «Ударнік».

У чырвоным кутку на ферме

---

НАШЫ КАНДЫДАТЫ Ў ДЭПУТАТЫ

### Марыя Грыгор'еўна Ігнатушка

Марыя ў сям'і калгасніцы Еўдакіі Паўлаўны Ігнатушка — сярэдняя дачка. Спрытная, вясёлая, яна паспявала ўсюды. Яе русая галоўка мільгала то на двары, то ў агародзе, то ў хаце — усюды Марыя знаходзіла сабе работу.

Калі дзяўчыне споўнілася 15 год, яна хадзіла працаваць на калгаснае поле і там сваёй лоўкасцю, працалюбівасцю і вясёласцю заваявала ўсеагульную павагу і любоў. Працаваць на сяўбе, убіраць ураджай, касіць сена, вазіць яго разам з сяброўкамі — усё гэта было надзвычай добра. Але не аб гэтым марыла Марыя. Яе цягнула на ферму.

У 1950 годзе дзяўчына прыйшла да загадчыка фермы буйнай рагатай жывёлы і папрасіла:

— Хачу даяркай працаваць, Сяргей Ільіч. Вазьміце да сябе на ферму.

Сяргей Ільіч Пабажак добра ведаў дзяўчыну па рабоце яшчэ ў трэцяй паляводчай брыгадзе, калі ён працаваў там брыгадзірам, і таму з ахвотай згадзіўся.

— Вось, даўно-б так!

З таго дня пачалася праца Марыі Ігнатушка на жывёлагадоўчай ферме калгаса «Ударнік».

Праца даяркі вельмі крапатлівая. І вынікі яе можна бачыць не адразу, а так, праз год — два. Марыя строга выконвала графік кармлення, паення, старанна даглядала за жывёлай.



**Марыя Грыгор'еўна Ігнатушка**

Вынікі першага года працы ў яе былі такія-ж, як і ва ўсіх даярак. Яна надаіла па 800 літраў малака ад кожнай замацаванай за ёю каровы. Марыя добра ведала, што гэтага недастаткова, і старанна падбірала сабе групу кароў з маладняку. У 1951—1952 г.г. надой малака павялічыўся. І самае галоўнае, Марыя набыла за гэты тэрмін багаты вопыт жывёлавода. Яна ўжо добра ведала і нават вучыла другіх, як лепш раздойваць кароў, як і чым трэба карміць жывёлу ў стойлавы перыяд, у перыяд ацёлу.

Маладая даярка па-ранейшаму сумленна выконвала свой абавязак. І кожны дзень прыносіў ёй новыя поспехі. У мінулым годзе Марыя надаіла ад кожнай замацаванай за ёю каровы па 1.400 літраў малака.

За самаадданую працу маладую калгасніцу члены арцелі двойчы выбіралі дэпутатам гарадскога Совета. Як дэпутат, яна многае зрабіла для сваіх выбаршчыкаў. Да яе неаднаразова звярталіся за дапамогай калгасніцы Ніна Ну[illegible]ава, Анна Пабажак, Елена Б[illegible]ханава, Лазар Гамуленка і многія іншыя. І Марыя заўсёды дапамагала ім карыснай парадай.

Вось чаму, калі хлебаробы сельгасарцелі «Ударнік» сабраліся на сход, прысвечаны вылучэнню кандыдатаў у дэпутаты раённага Совета, яны аднадушна назвалі імя лепшай даяркі комсамолкі Марыі Грыгор'еўны Ігнатушка.

**Г. Шаўчак.**

**1954 г.**



Рекуператорщица
шиферного завода
**Нина СОЛОВЬЕВА**

### Перадавая рэкуператаршчыца

Невысокага росту дзяўчына з блакітнымі вачыма стаіць ля конуса рэкуператара і ўважліва сочыць за яго работай. Вось яна зрабіла прадуўку конуса, павярнула рычаг—і вада з напорам бяжыць па жолабу ў катлы, дзе нарыхтоўваецца азбацэментная маса.

Час ад часу дзяўчына робіць чыстку труб. Работа нескладаная, але патрабуе вялікай акуратнасці і сумленнасці. Засорыцца труба або канал, і вада не будзе паступаць у цэх, спыніцца работа ўсяго прадпрыемства. Вось чаму, калі вытворчы цэх не мае прастояў з-за недахопу вады, гэта значыць, што Ніна Салаўёва таксама ўносіць долю сваёй працы ва ўсеагульную справу.

На здымку: Ніна Салаўёва.

**1955 г.**



# ЛЮБІМАЯ СПРАВА

Некалькі год я працую даяркай у калгасе «Сацыялістычны шлях» гарадскога Савета. Даенне кароў стала маёй любімай справай. І гэта невыпадкова, бо ў маёй працы ёсць поспех і я ганаруся ім. У мінулым годзе я надаіла па 1150 літраў на кожную карову. Заклік партыі — дагнаць у бліжэйшыя гады Злучаныя Штаты Амерыкі па вытворчасці мяса, малака і масла на душу насельніцтва — выклікаў у маім сэрцы новы патрыятычны ўздым. У бягучым годзе я ўзяла абавязацельства надаіць ад кожнай каровы па 1600 літраў малака.

У практычнай рабоце я пераканалася, што для атрымання высокіх надояў патрэбна не толькі добра карміць жывёлу, але і старанна, з любоўю даглядаць яе. Карова, як і чалавек, вельмі любіць ласку. Паспрабуй абыякава падыйсці да яе — яна не аддасць усё малако.

У маёй групе налічваецца 14 дойных кароў. У кожнай з іх ёсць свая мянушка. Калі я падыходжу да каровы, то ласкава пагладжу яе і «пагутару» з ёй, дам з'есці кавалачак хлеба або бульбіну.

Хачу сказаць, што на стойлавы перыяд жывёла поўнасцю забяспечана грубымі кармамі. На кожную карову нарыхтавана па 9 тон сіласу.

За прайшоўшыя 9 месяцаў бягучага года я надаіла на карову па 1450 кілаграмаў малака. Узятае абавязацельства да канца года я не толькі выканаю, але і перавыканаю.

Н. Прохарава,
даярка калгаса „Сацыялістычны шлях".

Доярка колхоза
«Соц. Шлях»
**ПРОХОРОВА Н.**

**1955 г.**

Екацярына Сцефаненка —валніроўшчыца. Яна працуе на другой тэхналагічнай лініі шыфернага завода. Разам са сваёй напарніцай Ірынай Курзавай яна сістэматычна перавыконвае нормы выпрацоўкі, даючы шыфер толькі выдатнай якасці.

Стаўшы на працоўную вахту ў гонар 37-й гадавіны Вялікай Кастрычніцкай соцыялістычнай рэвалюцыі, валніроўшчыцы падлічылі свае магчымасці і рашылі павысіць прадукцыйнасць працы на 20—30 працэнтаў. Рулоны поўфабрыката, металічныя формы, скалкі, пры дапамозе якіх робяцца хвалі на лістах шыфера,—усё неабходнае знаходзіцца пад рукамі. Рухі іх разлічаны дакладна, і яны спрытна, без затрымак, валніруюць шыфер.

У перадсвяточныя дні валніроўшчыцы Сцефаненка і Курзава выконваюць зменныя нормы на 150—170 працэнтаў.

НА ЗДЫМКУ: валніроўшчыца Е. Сцефаненка.

Лучшая волнировщина технологической линии шиферного завода **Екатерина СТЕФАНЕНКО**



**1955 г.**

Калгасны ільнавод Елена Мінаўна Краўцова разам са сваім звяном атрымала па 6 цэнтнераў ільносемя з кожнага гектара на плошчы 8 гектараў. Не шкадуючы сваіх сіл, ільнаводы даглядалі пасевы, і таму такія выдатныя вынікі: кожны гектар ільну даў калгасу 12 тысяч рублёў прыбытку.

Звеньевая по выращиванию льна –

**Елена Миновна КРАВЦОВА**



**1955 г.**

Звеньевая колхоза
«им. Ленина»
**Е.А. АНТИПЕНКО**,
получив по 6 центнеров
льносемени на площади
6 гектар



**1957г.**

У добрым стане трымае сваіх кароў даярка Наталля Маісееўна Балоннікава. Гэта дае ёй магчымасць няспынна павышаць прадуктыўнасць жывёлы. У гэтым годзе даярка ад 14 замацаваных за ёю кароў атрымала 14 цялят і надаіла па 1.300 літраў малака ад кожнай каровы.

# Передовая доярка – **Наталья Моисеевна БОЛОННИКОВА**

**1958 г.**





Павольна рухаецца канвеер. Па ім транспартыруецца клінкер з цэха абпалу ў клінкерны склад цэха памолу. За бесперапыннай працай канвеера ўважліва сочыць Ульяна Ігнацьеўна Караценка. Яна імкнецца не дапусціць апракідвання каўша, што можа выклікаць працяглы прастой усёй канвеернай ленты, своечасова змазвае труцца дэталі.

Калі працуе канвеершчыца Ульяна Ігнацьеўна, яе рабочае месца заўсёды знаходзіцца ў культурным стане. За 9 гадоў працы на камбінаце тав. Караценка добра вывучыла свае абавязкі і зараз добрасумленна выконвае іх. Прозвішча лепшай канвеершчыцы занесена ў кнігу пашаны цэментна-шыфернага камбіната.

В. Скрабкоў.

На здымку: У. І. Караценка.

Конвеерщица клинкерного цеха –

**<u>Ульяна Игнатьевна КОРОТЕНКО</u>**



**1958 г.**



Жывёлаводы калгаса «Ленінскі заклік» у бягучым годзе абавязаліся надаіць на адну фуражную карову 2.300 кілаграмаў малака. За шэсць месяцаў і 20 дзён яны надаілі ўжо ад кожнай каровы па 1318,8 кілаграма. У сацыялістычным спаборніцтве калгасаў раёна па надоях малака за чэрвень сельгасарцель заваявала першынство.

Нямала добрых даярак, энтузіястаў сваёй справы, працуе на малочна-таварнай ферме арцелі. Сярод [illegible] — Н. І. Сяргеева, я[illegible]ая [illegible]а паўгода надаіла па 1.2[illegible] кілаграмаў малака [illegible] [illegible]жнай каровы, Н. Я. Бурк[illegible]сава, надаіўшая па 1.213 кілаграмаў.

Два гады працуе даяркай Еўдакія Сцяпанаўна Забаўская. Сёлета яна абавязалася надаіць ад кожнай каровы сваёй групы па 2.500 кілаграмаў малака. Сваё абавязацельства яна паспяхова выконвае. За 6 месяцаў і 20 дзён даярка надаіла ўжо больш 1.200 літраў малака.

Дарагія таварышы! Бярыце прыклад з перадавікаў!

Фота Л. Песькіна.

Доярка колхоза
«Ленинский Заклик»-
**<u>Евдокия Степановна</u>**
**<u>ЗАБАВСКАЯ</u>**,
за 6 месяцев и 20 дней
доярка надоила около
1.200 литров молока



**1958 г.**



Раіса Іванаўна Міхальчанка даяркай у калгасе «Запаветы Ільіча» працуе чацвёрты год. У мінулым годзе за высокія паказчыкі па надоях малака яна ўзнагароджана медалем «За працоўную доблесць».

Сёлета ў групе Раісы Іванаўны 16 кароў. За 7 месяцаў бягучага года даярка надаіла ад кожнай з іх па 1216 літраў малака, у тым ліку за ліпень—283 літры.

—Сваё абавязацельства—надаіць 2.000 літраў малака ад каровы,—гаворыць Раіса Іванаўна,—выканаю.

НА ЗДЫМКУ: Р. І. Міхальчанка.

Фота Л. Песькіна.

Доярка колхоза «Заветы Ильича» –
**Раиса Ивановна МИХАЛЬЧЕНКО**,
за 7 месяцев 1958 г. Надоила от каждой коровы по1216 литров молока



**1958 г.**



Чатыры гады працуе даяркай ў сельгасарцелі «Запаветы Ільіча» Анастасія Міхайлаўна Лукашова.

За гэты час яна набыла пядрэнны вопыт, у рабоце і дабіваецца добрых поспехаў па надою малака. Анастасія Міхайлаўна— лепшая даярка калгаса.

Летась таз. Лукашова надаіла ад кожнай з 15-ці замацаваных за ёю кароў па 2 тысячы кілаграмаў малака. Сёлета ў гонар 40-годдзя БССР яна абавязалася надаіць ад каровы па 2200 кілаграмаў малака.

Узятае абавязацельства Анастасія Міхайлаўна з чэсцю выконвае. За прайшоўшыя 8 месяцаў бягучага года яна надаіла па 1.644 літры малака ад каровы. Зараз, па становішчу на 10 верасня, ужо мае — па 1715 літраў малака ад каровы.

—Горача адабраючы пастанову Пленума ЦК КПСС аб скліканні нечарговага XXI з'езда КПСС,—гаворыць Анастасія Міхайлаўна,—я рашыла з'езд роднай Камуністычнай партыі сустрэць новымі працоўнымі перамогамі. У верасні надаю ад каровы не менш чым па 250 кілаграмаў малака, у кастрычніку—220, у лістападзе — 200, у снежні—100 кілаграмаў малака. Буду змагацца за тое, каб сёлета надаіць ад каровы не менш чым па 2.350 кілаграмаў малака. Гэта будзе маім працоўным падарункам XXI з'езду Камуністычнай партыі Савецкага Саюза і 40-годдзя БССР.

**П. Шаўцоў.**

На здымку: лепшая даярка калгаса „Запаветы Ільіча"—Анастасія Міхайлаўна Лукашова.

Фота Л. Песькіна.

Доярка колхоза «Заветы Ильича» –

**Анастасия Михайловна ЛУКАШОВА,**

за 8 месяцев 1958г. Надоила от каждой коровы по 1644 литров молока

**1958г.**





Тацяна Загурская не проста радавы член сельгасарцелі «Перамога», яна лепшая калгасніца. У 1957 годзе камсамолка выпрацавала 370 працадзён, а сёлета за 7 месяцаў—286 працадзён, пры мінімуме 180.

Тацяну Венедзіктаўну мы знайшлі на полі. Разам з другімі жанчынамі яна церабіла лён. Работа звычайная. Толькі і тут адразу кідаецца ў вочы спрытнасць, з якой працуе дзяўчына. Яна абагнала сваіх сяброўак, выцерабіла большы ўчастак ільну, хоць пачалі работу ўсе адначасова.

—Яна заўсёды ідзе ўперадзе,—гаворыць брыгадзір,—выдатна працуе, добрасумленна выконвае любыя заданні. Цяпер нават і ноччу ходзіць на работу. Днём вось жне, або цярэбіць лён, а ноччу ўдзельнічае ў стагаванні саломы.

У 1955 годзе Тацяна Загурская скончыла сямігодку і пайшла працаваць у паляводчую брыгаду. У першы ж год выпрацавала 225 працадзён. Дзяўчына старанная, працавітая.

П. Шаўцоў.

На здымку: камсамолка Тацяна Загурская.

Фота Л. Песькіна.

Лучшая работница колхоза «Победа» - **Татьяна Венедиктовна ЗАГУРСКАЯ**



**1958 г.**



У сацыялістычным спаборніцтве жывёлаводаў раёна першынство ў ліпені заваявала даярка калгаса „Запаветы Ільіча" Раіса Міхайлаўна Міхальчанка. Ад кожнай замацаванай за ёю каровы яна надаіла 258 літраў малака. Рашэннем райвыканкома і райкома партыі тав. Міхальчанка прысвоена ганаровае званне лепшай даяркі раёна.

Даць Радзіме як мага больш малака—такія абавязацельствы даяркі, узятыя ў гонар XX з'езда Комуністычнай партыі Совецкага Саюза.

Доярка колхоза «Заветы Ильича» - **Раиса Михайловна МИХАЛЬЧЕНКО,** **присвоено почетное звание «Лучшей доярки района»**



**1958г.**



Упершыню працаваць на свінаферму я прышла пяць год таму назад. З першых дзён горача палюбіла сваю справу. Замацаванае за мною пагалоўе жывёлы заўсёды прыгледжана, знаходзіцца ў добрым стане. За перыяд сваёй працы выгадавала каля тысячы парасят. З году ў год паказчыкі ў вырошчванні парасят паляпшаюцца. Так, у 1957 годзе ад кожнай замацаванай за мною свінаматкі атрымала па 7 дзелавых парасят, а ў наступным годзе—па 15.

Карпатлівая праца прынесла добрыя вынікі і сёлета. За мною замацавана 18 свінаматак—13 асноўных і 5 разавых. Для іх утрымання стварыла добрыя ўмовы і дзякуючы дбайнаму догляду ад 13 апарасіўшыхся свінаматак атрымала ў сярэднім па 10 парасят.

Распарадак рабочага дня—для мяне закон. Я ведаю, што правільнае і своечасовае кармленне жывёлы—залог поспеху. І стараюся не ўпускаць у сваёй рабоце ні адной дробязі, падтрымліваю ў свінарніку чыстату і парадак. Як і іншыя свінаркі, штодзённа выганяю сваю групу свінаматак пасвіцца на прыфермскі ўчастак канюшыны.

У першым годзе сямігодкі рашыла выгадаваць па 16 парасят ад кожнай свінаматкі.

М. Дарогіна,
свінарка калгаса „Сацыялістычны шлях".

Лучшая свинарка колхоза «Соц. Шлях» – **Мария Ивановна ДОРОГИНА**



**1958 г.**



Камсамолка Раіса Камісарава даяркай працуе другі год. Летась яна надаіла ад кожнай каровы сваёй групы па 1634 кілаграмы малака. Сёлета, у гонар 40-годдзя БССР, Раіса абавязалася надаіць па 2.300 кілаграмаў малака ад каровы.

Свае слова дзяўчына з чэсцю стрымлівае. За шэсць з палавінай месяцаў яна надаіла ад каровы па 1.275 кілаграмаў малака.

На здымку: даярка Раіса Камісарава.

**Фота П. Шаўцова.**

Доярка – **Раиса КОМИСАРОВА**,
за 6 месяцев 1959 г. надоила от каждой коровы по 1275 литров молока



**1959 г.**



Полировщица шиферного цеха – **Антонина ДАВЫДЕНКО**

Камсамолка Антаніна Давыдзенка працуе валіроўшчыцай шыфернага цэха цэментна-шыфернага камбіната. Яна, перадавая работніца вытворчасці, яна была ўдзельніцай рэспубліканскай нарады работнікаў прамысловасці будаўнічых матэрыялаў, дзе атрымала каштоўны падарунак.

А. Давыдзенка, перайшоўшы на 7-гадзінны рабочы дзень, выконвае змесныя заданні на 105 працэнтаў. У гонар 40-годдзя БССР яна атрымала падзяку і грашовую прэмію ад дырэкцыі камбіната.

**1960 г.**



У мінулым годзе свінарка калгаса імя Карла Маркса Пелагея Лаўрэнцьеўна Ягорава адкарміла 60 галоў свіней вагою па аднаму цэнтнеру кожная. Поспехі ў працы свінаркі адзначаны ўрадавай узнагародай— медалем «За працоўную доблесць».

У адказ на ўзнагароду Пелагея Лаўрэнцьеўна абавязалася працаваць яшчэ лепш. У бягучым годзе яна дала слова адкарміць 149 галоў свіней.

З добрымі працоўнымі поспехамі сустрэла Пелагея Лаўрэнцьеўна ўсенароднае свята 1 Мая. За чатыры месяцы яна адкарміла ўжо 46 галоў свіней агульнай вагою 3.891 кілаграм.

На здымку: свінарка П. Л. Ягорава.

Свинарка колхоза
«Карла Маркса» –
**Пелагея Лаврентьевна ЕГОРОВА,**
откормила 60 голов
свиней весом по одному
центнеру каждый.
Награждена медалью
«За трудовую доблесть»



**1960 г.**

Соф'я Аляксееўна Васількова за сакавік заваявала першынство ў спаборніцтве сярод даярак раёна, за што ўзнагароджана Ганаровай граматай райкома партыі і райвыканкома.

За тры месяцы і 20 дзён красавіка перадавая даярка саўгаса «Чэрыкаўскі» С. А. Васількова надаіла ад кожнай каровы сваёй групы па 887 кілаграмаў малака. Цяпер надоі на карову складаюць па 13,1 кілаграма, а некаторыя даюць па пуду малака ў суткі.

Таварышы даяркі! У барацьбе за вялікае малако раўняйцеся на Соф'ю Аляксееўну Васількову!

Фота В. Іванова.

Доярка совхоза «Чериковский» –
**<u>Софья Александровна ВАСИЛЬКОВА</u>**,
За 3 месяца и 20 дней апреля 1960 года от каждой коровы своей группы по 887 кг. молока



**<u>1961 г.</u>**

Эмілія Кутава з такіх людзей, для якіх самае галоўнае — праца, мірная і плённая праца на карысць Радзімы. Рукі яе могуць рабіць усё: знішчаць на калгасных палях пустазелле, зграбаць сена, убіраць бульбу...

Сёлета яна вызначылася на вырошчванні кукурузы. Звяно, узначальваемае Эміліяй Кутавай, папрацавала на славу, атрымаўшы па 905 цэнтнераў зялёнай масы з кожнага гектара на плошчы 16 гектараў.

Многа добрых спраў зробяць яшчэ рукі радавой калгасніцы сельскагаспадарчай арцелі «Рассвет».

Фота Л. Песькіна.

Работница колхоза «Рассвет» -

**Эмилия КУТОВА**

**1961 г.**





Марыя Дзмітрыеўна Іллянкова шмат год была даяркай у калгасе „Запаветы Ільіча". Старая жанчына самааддана працавала на даверaным ёй участку жывёлагадоўлі. За выдатныя працоўныя поспехі Марыя Дзмітрыеўна была вылучана кандыдатам на Усесаюзную сельскагаспадарчую выстаўку, узнагароджана медалем удзельніка выстаўкі.

Але прышоў час, калі старой калгасніцы трэба было развітацца з работай на ферме. Хто заменіць яе?

Адказ на гэта пытанне дала Марыі Дзмітрыеўне яе дачка— камсамолка Раіса. Яна сказала маці:

—Я пайду працаваць на ферму.

Гэта было два гады назад. На першых парах маладой даярцы давялося пераадолець нямала цяжкасцей. Таварышы па рабоце, заатэхнік калгаса, загадчык фермы, сяброўкі-даяркі заўсёды дапамагалі Раісе парадай. А больш усіх дапамагала маці. Усё гэта не прайшло дарэмна.

Першы год прынёс камсамолцы Іллянковай працоўныя поспехі. Яна заваявала ў сацыялістычным спаборніцтве даярак калгаса адно з першых месц.

У гэтым годзе Раісе давялося спаборнічаць з самымі маладымі, але самымі лепшымі даяркамі калгаса „Запаветы Ільіча"—Зояй Варанцовай, Марфай Войціхавай і Раісай Міхальчанка.

Зоя Варанцова неаднаразова заваёўвала званне „Лепшай даяркі раёна". Не меншых поспехаў дабілася і Марфа Войціхава. Не шкадуючы сіл і часу, Раіса працавала на ферме. Яна старанна даглядала кароў, дакладна выконвала парады заатэхнікаВаскабойнікавай.

І днямі, калі былі падлічаны вынікі работы даярак за год, стала вядома, што Раіса Іллянкова надаіла ад кожнай замацаванай за ёю каровы 1.727 літраў малака. Толькі Зоя Варанцова дабілася вышэйшага паказчыку.

Камсамольцы-жывёлаводы калгаса „Запаветы Ільіча" дабіваюцца ўсё новых поспехаў у рабоце. І разам з імі самааддана працуе Раіса Іллянкова.

М. Мельнікаў.

Доярка колхоза «Заветы Ильича» -

**Мария Дмитриевна ИЛЬЕНКОВА**

**1961 г.**





На жывёлагадоўчай ферме я працую ўсяго толькі адзін год. Калі мая маці з даярак перайшла працаваць пастухом, я рашыла заняць яе месца на ферме.

Спачатку было занадта цяжка спраўляцца з работай. Я не ўмела правільна арганізаваць рабочы дзень. На дапамогу прышла маці. Яна перадала мне свой вопыт працы даяркай.

Пастаянна клапоціцца аб нас загадчык фермы Герасім Арцёмавіч Іллянкоў. Ён заўсёды прыходзіць на дапамогу ў цяжкі момант. Дае карысныя парады. Заатэхнік т. Воскабойнікава таксама часта бывае на нашай ферме, сочыць за правільным утрымаваннем кароў і г. д.

У сваю чаргу, мы стараемся як мага лепш выконваць свае абавязкі.

У сваёй практыцы я шмат увагі ўдзяляю правільнаму кармленню кароў, з улікам іх індывідуальных асаблівасцей. Заатэхнік пры састаўленні рацыёна кармоў заўсёды раіцца з даяркамі, улічвае нашы заўвагі і пажаданні. Вядома, што высокія надоі малака можна атрымаць толькі тады, калі каровам даецца шмат сакавітых кармоў. У пачатку лета, нягледзячы на тое, што каровы кругласутачна знаходзіліся на пашы, мы арганізавалі падкормку іх жомам.

Добры догляд за каровамі таксама мае вялікае значэнне для павышэння прадукцыйнасці статку. Я заўсёды прытрымліваюся строгага распарадку дня. Даенне кароў выконваю ў адзін і той-жа час, у адным і тым-жа месцы. Удасканальваю метады даення.

У бліжэйшыя дні каровы будуць пераведзены з луга на ферму. Тут будзе арганізавана зялёная падкормка. У якасці падкормкі выкарыстаем кукурузу. Добра арганізаваны догляд кароў дае станоўчыя вынікі. За дзевяць месяцаў нашы жывёлаводы дабіліся такога надою малака, які быў атрыман за ўсе 12 месяцаў мінулага года.

Сёлета я змагаюся за атрыманне ад кожнай каровы па 2 тысячы літраў малака.

З. Варанцова,
даярка калгаса
«Запаветы Ільіча».

Лучшая доярка колхоза «Заветы Ильича» -

**<u>Зинаида ВОРОНЦОВА</u>**

**<u>1961 г.</u>**





Работница колхоза «Ленинский призыв» - **Мария Демьяновна ИВАНОВА**

У бягучым годзе жывёлаводы сельскагаспадарчай арцелі «Ленінскі прызыў» дабіліся значных поспехаў у павышэнні прадукцыйнасці грамадскай жывёлагадоўлі. На адну фуражную карову тут надоена па 1.121,9 кілограма малака. Адной з перадавых даярак калгаса з'яўляецца Марыя Дзем'янаўна Іванова. Ад 15 замацаваных за ёю кароў яна атрымала сёлета па 1.207 літраў малака.

Яшчэ з самага пачатку пашавага ўтрымання жывёлы Марыя Дзем'янаўна, уключаючыся ў сацыялістычнае спаборніцтва за атрыманне высокіх надояў малака, марыла заваяваць права на ўдзел у раённай сельскагаспадарчай выстаўцы. І вось мара здзейснілася. Яна — удзельнік выстаўкі.

Па прадстаўленню раённага выставачнага камітэта за дасягнутыя поспехі ў павышэнні надояў малака даярка Марыя Іванова была зацверджана ўдзельнікам раённай сельскагаспадарчай выстаўкі.

**1962 г.**



Телятница колхоза «Правда» -

**<u>Татьяна Сергеевна ПЕТРОВА</u>**

Тацяна Сяргееўна Пятрова некалькі год працавала цялятніцай у калгасе „Праўда". Старанна, з любоўю і веданнем справы даглядала яна маладняк буйнай рагатай жывёлы. Асабліва добрых паказчыкаў дабілася Тацяна Сяргееўна ў бягучым годзе. Група цялят-сеняткоў, якіх вырошчвала Пятрова разам са сваёй напарніцай Нінай Цыганковай, хутка расла і прыбывала ў вазе. Штодзённая прывага кожнага цяляці склала па 650 грамаў.

Нядаўна ў праўленні калгаса ўзняла пытанне аб назначэнні людзей на догляд за свіннямі. Тацяна Пятрова першай выказала жаданне пайсці працаваць на свінаферму і з задавальненнем узялася за гэту адказную справу. Яна пачала вырошчваць 100 галоў маладняку свіней ад 2 да 4-месячнага ўзросту. Пажадаем Тацяне Сяргееўне поспехаў на новай рабоце.

Фота М. Шчарбакова.

**<u>1962 г.</u>**

Лучшая свинарка колхоза «Победа» - **Зинаида Егоровна КУЗЬМИЦКАЯ**



## Запявала спаборніцтва

Зінаіда Ягораўна Кузьміцкая — лепшая свінарка сельгасарцелі «Перамога» Батвінаўскага сельсавета. У мінулым годзе ад кожнай свінаматкі яна атрымала па 12,8 парасят.

Сёлета Зінаіда Ягораўна стала ініцыятарам спаборніцтва за высокія паказчыкі ў вырошчванні маладняку. Яе сацыялістычнае абавязацельства атрымаць 18 дзелавых парасят ад асноўнай і 5 —ад кожнай разавай свінаматкі.

Працавітая свінарка вылучана кандыдатам у дэпутаты раённага Савета. Аказанае ёй давер'е яна апраўдае з гонарам.

**1962 г.**



**Благодаря самоотверженному женскому труду, сельское хозяйство и промышленность БССР удалось восстановить и значительно развить. Женщины передовики - эти женщины, которые, действительно, трудились на селе, трудились своими руками.**

**Основание: Ф. 27**. **Оп.2.Д.4.**Л.85,233,269,271; **Д.5**.Л.27,181,262; **Д.18.**Л.34,109,175,193,219; **Д.29.**Л.297,304; **Д.36.Л.**33,57.